Viestki540.qxd 2/1/2011 6:13 PM Page 1 (3,1)


# Весткі й Паведамленьні

Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня

Viestki j Paviedamlenni

№ 2 (540)
Люты 2011 г.



Belarusan American Association, Inc.
P. O. Box 572, New York, NY 10113-0572


Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org

## ЗАЯВА КІРАЎНІЦТВА НЬЮ-ЁРСКАГА АДДЗЕЛУ БАЗА

Памылкі й хібы, зь якімі быў праведзены Кангрэс БАЗА 30 траўня 2009 г., паставілі пад пытаньне легітымнасьць сфармаванай на ім цяперашняй Галоўнай управы БАЗА. Гэтыя памылкі й хібы былі пералічаныя ў заяве аб патрэбе надзвычайнага Кангрэсу БАЗА, да якой у сьнежні 2009 г. далучыліся 11 дэлегатаў Кангрэсу. Адзіным легітымным актам асобаў, што сёньня складаюць Галоўную ўправу БАЗА, магло б стаць склiканьне Надзвычайнага Кангрэсу БАЗА, што выправіў бы праблемы, зьвязаныя з папярэднім Кангрэсам, і зьняў бы ўсе спрэчныя пытаньні.

Нажаль, цяперашні склад Галоўнай управы БАЗА праігнараваў гэтую магчымасьць выправіць хібы і памылкі і сьведама, пад штучным прэтэкстам, адкінуў законныя, абгрунтаваныя ў заяве ад сьнежня 2009 г., патрабаваньні дэлегатаў Кангрэсу. 26 студзеня сёлета было распаўсюджана паведамленьне Галоўнай управы БАЗА аб склiканьні 13 лютага 2011 г. Надзвычайнага Кангрэсу БАЗА. Замест парадку дня, запатрабаванага ў заяве ад сьнежня 2009 г., цяперашні склад Галоўнай управы паставіў іншы, з пытаньнямі што ёсьць істотныя, але другасныя ў параўнаньні з выпраўленьнем хібаў і памылак Кангрэсу 30 траўня 2009 г., і захаваньня адзінства і статутовай законнасьці ў нашай агульнай арганізацыі.

Варта нагадаць, што адным з патрабаваньняў для выпраўленьня сёнешняга канфліктнага стану справаў у БАЗА было аднаўленьне магчымасьці для Нью-Ёрскага аддзелу праводзіць свае сходы й імпрэзы ў памешканьні Фундацыі імя П. Крэчэўскага. Цяперашняя Галоўная ўправа мае туды неабмежаваны доступ і нават падае адрас Фундацыі як свой афіцыйны адрас. Між тым доступ Нью-Ёрскаму аддзелу БАЗА ў Фундацыю дасюль зачынены дзеля таго, што там, быццам, адбываецца рамонт.

Нью-Ёрскі аддзел БАЗА заяўляе, што толькі неадкладны Надзвычайны Кангрэс можа выправіць праблемы, узьніклыя падчас Кангрэсу 30 траўня 2009 г. Любыя вынікі дзейнасьці цяперашняй Галоўнай управы, легітымнасьць якой знаходзіцца пад пытаньнем (за выняткам склiканьня Надзвычайнага Кангрэсу з запатрабаваным у заяве ад сьнежня 2009 г. парадкам дня), ня маюць належнай законнай сілы. На асобы, што сёньня складаюць Галоўную ўправу БАЗА, кладзецца пэрсанальная адказнасьць за наўмыснае зацягваньне вырашэньня праблемаў еднасьці й належнага функцыянаваньня Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня.

Заклікаем іншыя структуры БАЗА далучыцца да гэтае заявы.

*31 студзеня 2011 г.*

# Дэманстрацыя на Мангэтане

Сябры Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ўзялі 19 студзеня ўдзел у ладжанай Публічным тэатрам, Міжнароднай амністыяй і Беларускім свабодным тэатрам акцыі пратэсту супраць рэпрэсіўнай палітыкі рэжыму Лукашэнкі. Дэманстрацыя пратэсту супраць тэрору і гвалту ў Беларусі і за вызваленьне ўсіх палітзьняволеных адбылася каля прадтаўніцтва Рэспублікі Беларусь пры Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў на скрыжаваньні 67-й вуліцы і Лексінгтан авэню на Мангэтане. На дэманстрацыю прыйшло некалькі сотняў чалавек, пераважна студэнцкай моладзі. Арганізатары імкнуліся правесьці гэтую акцыю ў дзень, калі мінуў роўна месяц з часу

*Заканчэньне на бачыне 4*



# Студзеньскі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА

У нядзелю, 15 студзеня, адбыўся чарговы студзеньскі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка азнаёміў прысутных з падзеямі ў Беларусі, а таксама падзеямі, датычнымі Беларусі, што адбыліся ў Нью-Ёрку і ў сьвеце. Ён адзначыў жорсткае падаўленьне рэжымам Лукашэнкі пратэстных акцыяў 19 сьнежня 2010 і ў наступныя дні, калі за кратамі апынуліся больш за 600 чалавек, сярод іх – 5 кандыдатаў на прэзыдэнцтва ад апазыцыі. Прамоўца ўзгадаў таксама рэакцыю сусьветнага супольніцтва на рэпрэсіі ў Менску і дэманстрацыі, што былі праведзеныя Нью-Ёрскім аддзелам БАЗА у сьнежні. Была зробленая аб'ява пра маючую адбыцца 19 студзеня дэманстрацыю пратэсту супраць тэрору і рэпрэсіяў у Беларусі, што заплянаваная насупраць прадстаўніцтва Беларусі пра Аб'еднаных Нацыях на 67-й вуліцы на Мангэтане.



З гутаркаю пра апошнія падзеі ў Беларусі, сьведкаю якіх ёй давялося стаць, выступіла сп-ня Марыя Садоўская, што вучыцца на журналісцкай праграме ў Калюмбійскім унівэрсытэце ў Нью-Ёрку. Сп-ня Садоўская напачатку коратка распавяла пра сябе, узгадала сваю працу ў газэце "Беларусы і рынак". Затым яна падзялілася сваімі ўражаньнямі ад наведаньня Беларусі ў канцы сьнежня мінулага году. Яна адзначыла, што, нягледзячы на жорсткае падаўленьне пратэсту супраць фальсыфікацыі вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў 19 сьнежня 2010 году і тое, што людзі менш схільныя абмяркоўваць "палітычныя" пытаньні ў гарамадзкіх месцах, усё-ж пратэстныя настроі ў грамадзтве, асабліва сярод моладзі, досыць высокія, і разумная палітычная тактыка і практыка апазыцыйных сілаў магла б скарыстаць гэтыя настроі супраць рэжыму. Праблема толькі ў разьяднанасьці і пэўнай дэзарганізацыі гэтых сілаў. Тым ня менш, часовы адыход з-за арыштаў ад справаў існуючых лідэраў апазыцыі зьмяшчае ў сабе магчымасьць прыходу новых эфэктоўных асобаў і пошук новых аптымальных мэтадаў супрацьдзеяньня рэжыму Лукашэнкі.

Прамоўца выказала сумніў у выніковасьці магчымых дзеяньняў краінаў вольнага сьвету супраць рэжыму Лукашэнкі. "Акрамя візавых забаронаў для фунцыянэраў рэжыму, любыя санкцыі будуць проста перакладзеныя на плечы грамадзянаў з адпаведным прапагандысцкім абвінавачваньнем Захаду. У рэжыму Лукашэнкі больш сымпатыкаў у Эўропе, чым мы сабе ўяўляем. ЗША больш прынцыповыя і пасьлядоўныя ў адносінах з рэжымам у Беларусі, але на нешта большае, чым раней прынятыя меры, яны наўрад ці пойдуць. Як вядома, былі ўведзеныя санкцыі супраць трох беларускіх урадавых кампаніяў: Белнафтахім, Лакафарба і Пінскдрэў. Санкцыі былі часова прыпыненыя, але сьмеху варта было б уважаць іх аднаўленьне за сур'ёзны крок, што змусіць Лукашэнку зьмяніць пазыцыю." Асаблівы непакой выклікае далейшае зацісканьне свабоды слова, націск на рэшту няўрадавых мэдыяў і магчымыя крокі па ўвядзеньні рэгуляцыі й кантролю за інтэрнэтам на манэр Бірмы, Ірану або Сынгапуру.

Затым сп-ня Садоўская адказала на пытаньні прысутных, сярод якіх былі пра ролю Расеі ў апошніх падзеях у Беларусі, пра магчымы лёс арыштаваных кандыдатаў у прэзыдэнты, пра рэйтынг апазыцыі сярод насельніцтва, якія дакумэнты пра Беларусь выплылі на Ўікілікс, а таксама што беларуская грамада за мяжою можа зрабіць для Беларусі. Выступ і адказы былі з цікавасьцю сустрэтыя прысутнымі.

Падчас сходу Ўладыка Юры (Рыжы) коратка акрэсьліў жыцьцёвы шлях і прачытаў малітву ў памяць выдатнага дзеяча беларускай грамады ў Амэрыцы, былога актыўнага дзеяча Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня сьв. пам. Францішка Бартуля (1918-2005). Прысутныя ўшанавалі хвілінай цішы памяць адданага сына беларускай зямлі, які адыйшоў у вечнасьць 5 год таму, 4 сьнежня 2005 г.

Затым адбылася свабодная дыскусія па мэтадах далейшай дзейнасьці аддзелу, асабліва дзеля шырэйшага і нязмушанага калегаваньня моладзі паміж сабою. Асноўным момантам было адзначана паляпшэньне абмену інфармацыяй і ініцыятывамі сярод маладых сябраў БАЗА. Як адзін з крокаў было вырашана стварыць групу BAZA-Belarus на сацыяльнай сетцы Vkontakte.

**Віталь ЗАЙКА**

# Падпольная выстава

Узгадваюцца мне нядаўнія часы, калі ў грамадзкай залі, што пры саборы БАПЦ у Брукліне, ладзіліся выставы Беларускага Музэю ў Нью-Ёрку. За два з паловаю гады было праведзена 29 выставаў і ня толькі ў грамадзкай залі сабору, але й на Мангэтане ва Ўкраінскім музэі, некалькі разоў у Нью-Джэрзі ды Кліўлэндзе, у Эстоніі, Нарвэгіі і двойчы ў Кангрэсе ЗША.

Адкрыцьцё кожнай выставы шырока анансавалася ў інтэрнэце і ў беларускай прэсе, каб усе жадаючыя маглі сплянаваць свой час і наведаць выставы.

Але зьмяніліся часы і абставіны. Беларускі музэй у Нью-Ёрку вымусілі сыйсьці з памешканьня пры саборы, і кіраваць мастацкім жыцьцём там быў прызначаны сябра сёньняшняй Галоўнай управы БАЗА Сяргей Капытка.

За амаль паўтары гады, якія прайшлі з таго часу, ніякой актыўнасьці ў саборы не назіралася. І раптам выпадкова я даведваюся, што нарэшце з ініцыятывы сп. Зянона Пазьняка ў Нью-Ёрк запрошаны выдатны мастак і чалавек Алег Аблажэй. Больш таго, 9 студзеня ўжо адбылося адкрыцьцё ягонае выставы ў грамадзкай залі пры саборы. Як жа так, што ніхто з аддзелаў БАЗА ў Нью-Ёрку і Нью-Джэрзі ня ведаў пра такую значную падзею?! Выглядае, што выстава рабілася амаль падпольна толькі для абраных, каб не маглі даведацца пра гэта нават даўнія сябры мастака. Ці гэтая выстава была зробленая толькі для галачкі, маўляў, і мы таксама ладзім выставы?

Як бы там ні было, а зьвязацца з А. Аблажэям не было ніякай магчымасьці. Можна толькі ўяўляць, як яго апрацавалі, калі мастак, прыляцеўшы праз акіян, нават ня ўспомніў пра былых сяброў, якія сёньня аказаліся ў няміласьці ў арганізатараў ягонае выставы. А калі сябры самыя пачалі яго шукаць, дык ім сказалі, што мастака ўжо даўно няма ў Нью-Ёрку, у час калі той яшчэ нікуды ня зьехаў.

Выглядае, што царкоўныя актывісты і сябры, т. зв., бруклінскага аддзелу БАЗА ўявілі сабе, што яны і ёсьць уся беларуская эміграцыя ў Нью-Ёрку, а ўсе астатнія шкоднікі і засланцы. Сумна, бо вельмі ўжо нагадвае манію велічы.

***Неабыякавы аматар жывапісу***

Viestki540.qxd 2/1/2011 6:13 PM Page 3 (3,1)



# Калядаваньне ў Нью-Ёрку

Вось ўжо чацьвёрты год з ініцыятывы сям'і Алены і Пятра Рыжых, якім за ўсё вялікі паклон, мы ладзім Каляды. Пачынаем у іхнай хаце і працягваем у хатах суседзяў-амэрыканцаў і знаёмых з бліжэйшага гарадку. Спачатку даводзілася тлумачыць, што тут і да чаго, і самым пакідаць пачастункі для нашых дзетак. Першы год нашых Калядаў яны былі вельмі разгубленыя і толькі выглядалі з-за дзьвярэй, але з часам зацікавіліся і зразумелі сэнс абраду, ягоны смак. І цяпер яны ветліва выходзяць з хатаў, глядзяць нашае прадстаўленьне, самыя рыхтуюць падарункі і, прыгожа запакаваўшы іх, адорваюць нас.



Алена і Пятро Рыжыя з сынамі зрабілі вялікую і прыгожую зорку-"сонца". Цэлы дзень завіхаліся дзеля сьвяточнага застольля. У куточку пакоя для прыёму гасьцей красавалася шыкоўная ялінка, упрыгожваць якую дапамагалі і абодвыя іхныя старэйшыя сыночкі – 5-гадовы Янка і 3-гадовы Алесік. Наймалодшага 10-месячнага Марцінку ў той дзень, каб разьвязаць рукі Аленцы, аддалі пад нагляд дзеду.

А 5-й вечара амаль адначасова прыехалі Сяржук Сокалаў-Воюш з жонкаю Ганнаю й сынамі-дзецюкамі Сьвятавітам і Славамірам, скульптар Алесь Шатэрнік ды Алесь і Юля Вінакуравы з іхным гадавалым Данілкам. Я прыехала на дзень раней, каб крыху сьпецца з Рыжымі.

Гаспадыня паставіла на стол сьвяточныя стравы, і калядоўшчыкі ў вышываных строях селі за стол. Сп. Шатэрнік сказаў невялікую прамову. Пачалося сяброўскае застольле, але бяз моцных напояў, з жартамі і сьмехам.

Праз гадзіну пачалося калядаваньне. Наперадзе йшоў зорканоша, тады каза, ролю якой па традыцыі выконвае той малады хлопец ці мужчына, які добра танчыць, пасьля, як вядучая сьвята, ішла я, за мною астатняя грамада. Мы віншавалі гаспадароў велічальнымі песьнямі, услаўлялі іхную працавітасьць. Амаль у кожнай хаце сьпявалі, хоць і не народную, але па тэме ды зразумелую ўсім без перакладу песьню ''Ціхая ноч, сьвятая ноч''. З чатырох першых хатаў, дзе жылі амэрыканцы, нам далі так шмат прысмакаў, што Сьвятавіт і Славамір, якія насілі іх, прапанавалі аднесьці накалядаванае дахаты.

Пасьля на аўтобусіку Рыжых усе паехалі ў суседні гарадок, дзе жыве шмат знаёмых Алены. Украінская сям'я запрасіла нас у хату. У адной зьмешанай расейска-грузінскай сям'і мы сорак хвілін старанна сьпявалі калядкі, і раптам нас папрасілі: "А теперь, пожалуйста, по-белорусски!" Нас гэта расьсьмяшыла. Мы перапыталі: "А што, вы лічыце, што мы сьпявалі па-расейску? Дык можа і самыя ведаеце хоць адну расейскую калядную песьню?'' – "Знаем" – быў адказ. І яны старанна зацягнулі: "В лесу родилась ёлочка..." Гэта нас яшчэ больш разьвесяліла, бо гэтую песьню напісала нараджаная ў Беларусі паэтка Раіса Кудашэва (нар. Гедройць).

У сям'і амэрыканцаў італьянскага паходжаньня, якая таксама ветліва запрасіла нас у хату, высьветлілася, што гэта знаёмая Алены Рыжай і Ганны Бартуль, якая апекавалася сіротамі і аднойчы была на Каляды ў Беларусі. Пачалі абдымацца. На разьвітаньне засьпявалі для яе дачкі:

Як узьняліся буйныя вятры,
Шчодры вячор, багаты вячор!

Калі ў хаце гаспадароў выгрузілі накалядаванае, там знайшлі аж сем пляшак добрага віна, якое мы так і не пакаштавалі, бо былі вясёлымі і без яго, шмат печыва, пірагоў, розмай смачнай усячыны, нават дзесяць далёраў і духмянае мыла ў выглядзе фігурак калядоўшчыкаў. Хоць кажуць, што "дарага ня піва, а дзіва", нам было дарага ўсё, асабліва тое, што пацыху мы пачалі ксьціць амэрыканцаў беларускаю традыцыйнаю культураю, і галоўнае – перадаваць беларускія традыцыі нашым дзеткам, дзеля якіх мы ўсё гэта і пачалі.

***Валянціна ЯКІМОВІЧ***

## ЛІСТЫ

### Хто ёсьць наш лідэр?

Сёй-той зрэдку сумняецца ў лідэрстве Зянона. А для самой рэальнасьці трэба зазірнуць у артыкул Сяргея Навумчыка "Найважнейшы палітычны вынік у гісторыі нацыі", які быў надрукаваны ў газэце "Беларус" № 550. Ніжэй падаю ўрывак з таго артыкулу:

"...ідэя лунала ў паветры і не магла быць выказаная... А вось яе практычная рэалізацыя залежыла ад таго, хто будзе абраны старшынём Мартыралёгу, бо ў той вечар менавіта гэтаму чалавеку даводзілася альбо завяршыць паседжаньне (паколькі абвешчаная ў запрашэньнях мэта была дасягнутая, "Мартыралёг" быў створаны), альбо – працягваць. Васіль Быкаў прапанаваў на пасаду старшыні Мартыралёгу Пазьняка, а затым, рашуча ўзяўшы з рук функцыянэра ЦК КПБ мікрафон, настаяў на галасаваньні па ягонай кандыдатуры. І далей пасяджэньне вёў ужо Пазьняк, зачытаўшы заранёў падрыхтаваны ім сьпіс членаў Аргкамітэту БНФ з 23-х асобаў, пры гэтым 12 асобаў былі прапанаваныя з залі (але да таго моманту праз Дубянецкага Пазьняк пасьпеў некаторых папярэдзіць, каб прапаноўвалі "сваіх" – гэта значыць, тых, хто стаіць на нацыянальных пазыцыях).

Такім чынам, Аргкамітэт БНФ быў утвораны і пачаў працу.

Для гісторыі беларускай нацыі стварэньне Беларускага Народнага Фронту было лёсавызначальным, бо менавіта БНФ як палітычная арганізацыя абвесьціў ідэю суверэнітэту Беларусі і ў выніку дамогся незалежнасьці..."

Выехаўшы на лета ў Эўропу Зянон вёў і цяпер вядзе інтэнсіўную палітычную дзейнасьць лідэра, навязваючы міжнародныя кантакты, сустракаючыся на дыскусіях, займаючыся выдавецтвам "Беларускія Ведамасьці" й шмат чым іншым.

Так што Зянон і надалей працягвае сваё лідэрства, як у Беларусі, так і ў дыяспары.

***С.***

Viestki540.qxd 2/1/2011 6:25 PM Page 1 (1,1)



# Дэманстрацыя на Мангэтане

*Заканчэньне з бачыны 1*

брутальнага разгону дэманстрацыі пратэсту ў Менску пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 19 сьнежня 2010 году.

Напачатку мітынгу прысутныя скандавалі лёзунгі "Жыве Беларусь" па-беларуску і ангельску, "Далоў Лукашэнку" па-ангельску: "Time is over! And we know – Lukashenka got to go!", "Human Rights and Freedom for Belarus!" ды іншыя. Дэманстранты трымалі бел-чырвона-белыя нацыянальныя сьцягі і плякаты з асуджэньнем кіраваньня Лукашэнкі й рэпрэсіяў супраць апазыцыі.

Затым з прамоваю выступіў мастацкі кіраўнік Публічнага тэатру заснавальнік Шэксьпіраўскага фэсту ў Нью-Ёрку Оскар Юстыс. Ён спыніўся на падзеях у Беларусі, антыдэмакратычным кіраваньні дыктатара Лукашэнкі і ўзгадаў перасьлед Беларускага свабоднага тэатру, дырэктар якога, прысутная на мітынгу, была арыштаваная падчас падзеяў 19 сьнежня. Ён адзначыў неабходнасьць дапамогі апазыцыйным сілам у Беларусі, і, як чалавек мастацтва, зьвярнуўся да калегаў з заклікам распачаць кампанію па агітацыі за такую дапамогу. Гэта трэба рабіць праз сваіх сэнатараў і кангрэсмэнаў, праз звароты да прэзыдэнта ЗША. Ён заклікаў дасылаць лісты пратэсту ў прадстаўніцтвы Беларусі ў Амэрыцы.

Драматург і сцэнарыст ("Анёлы ў Амэрыцы", "Мюнхен"), ляўрэат Прэміі Пуліцара Тоні Кушнер прачытаў ўрыўкі зь лістоў арыштаваных у Менску, што былі перададзеныя на волю, а таксама чытаў урывак з п'есы "Быць Гаральдам Пінтарам", зь якою выступае ў Амэрыцы Беларускі свабодны тэатар.

Сузаснавальніца гэтага тэатру, сп-ня Натальля Каляда, распавяла пра свой арышт і пра падзеі 19 студзеня і заклікала грамадзянаў Амэрыкі, усіх людзей добрай волі дапамагчы Беларусі пазбавіцца ад дыктатуры.

Удзельнікі акцыі перадалі ў прадстаўніцтва Беларусі копію пэтыцыі, якая была накіраваная спэцкамісару ААН па правох чалавека.

Інфармацыя пра акцыю трапіла ў такія вядучыя масавыя мэдыі як *CNN*, *The New York Times* і *BBC*.

Дэманстрацыя пратэсту стала адною з самых масавых акцыяў ў Амэрыцы за ўвесь час панаваньня Лукашэнкі.

**Віталь ЗАЙКА**

## Беларускі музэй у Нью-Ёрку

запрашае на сваю чарговую 31-ю выставу. Гэтым разам майстрыхі **Любові Карпавай** (*34 абразы, вышытыя пацеркамі*), якая адкрыецца ў нядзелю **13 сакавіка 2011 г.** апаўдні ў грэцкай праваслаўнай царкве, што месьціцца на скрыжаваньні **Avenue P** і **E. 18th Street** у Брукліне.

*Даезд цягнікам падземкі **G** да прыпынка **Kings Hwy**.*

## Гуканьне Вясны

адбудзецца ў нядзелю **20 сакавіка 20011 г.** апаўдні ў ***Ossining Boat and Canoe Club*** па адрасу: ***1 Westerly Road, Ossining, NY 10562***.

*Даезд прыгарадным цягніком з **Grand Central** у напрамку **Croton / Poughkeepsie** да прыпынку **Ossining** (45 min.) Побач са станцыяй парк на рацэ і будынак клюбу.*

*Пажадана, каб удзельнікі сьвята былі ў беларускіх строях, ці хаця б ў сьветлых штанах / доўгіх спадніцах. Сьвята пачнецца з абрадавых карагодаў сярод лагодных краявідаў на Гудзоне, пазьней працягнецца ва ўтульным клюбе гарачым абедам. Чакаем на налісьнікі з бульёнам ды іншымі традыцыйнымі стравамі й прысмакамі.*

Квіткі **$10** дарослым, **$5** дзецям.

Арганізатары **Пятро і Лена Рыжыя** прасяць зьвязацца зь імі загадзя па тэл. ***(914) 522- 0742*** ці эл. пошту ***lenabelarus@yahoo.com***.

### Уплаты ў Нью-Ёрскі аддзел БАЗА

Складкі і ахвяраваньні:

| | |
|---|---|
| Г. Астапчук | .50 |
| Я. Барысевіч | .50 |
| Т. Бойка | .50 |
| М. Градовіч | .50 |
| І. Дзесюкевіч | .50 |
| В. Едзіновіч | .50 |
| Я. Канчына | .50 |
| С. Крывіцкі | .50 |
| З. Левіт | .50 |
| М. Мароз | .50 |
| Д. Мураўёва | .50 |
| В. Пакорская | .50 |
| Ш. Саркісян | .50 |
| А. Фішук | .50 |

**Усім шчыры дзякуй!**

### Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

*Belarusan American Association*
*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*

**Чэкі выпісвайце на** *Belarusan American Association.*

## НАСТУПНЫ СХОД

Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **ў суботу**, **12-га лютага 2011 г.** на Мангэтане.

Месца правядзеньня сходу:

***Seafarers and International House***
***123 East 15th Street***
***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі **Union Square**. Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Юніян-скўэр па 15-й вуліцы, на скрыжаваньні з Ірвінг-плэйс.*

Заля месьціцца на **2-м** паверсе.

Пачатак сходу: **а 6:00-й** вечара.

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА ды іншых імпрэзаў, ладжаных аддзелам, можна даведацца, наведаўшы ўэбстаронку **www.baza-belarus.org***

### Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

| | |
|---|---|
| Г. Астапчук | .50 |
| В. Балашчанка | .50 |
| Я. Барысевіч | .50 |
| М. Градовіч | .50 |
| С. Крывіцкі | .50 |
| Д. Мураўёва | .50 |
| Ш. Саркісян | .50 |
| А. Фішук | .50 |
| Ю. Хруцкая | .50 |

**Шчыры дзякуй!**

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі ($30). Чэкі выпісвайце на **Belarusan American Association**.*

*Рэдакцыю бясплатна надрукуе прыватныя некамэрцыйныя абвесткі, а таксама будзе ўдзячная за дасланыя чытачамі і сябрамі водгукі й лісты.*

*Допісы ў рэдакцыю накіроўвайце на адрас:* ***VIESTKI***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
*альбо на адрас электроннай пошты:* ***viestki@mail.com***